Вершаваныя пасланні Я. Коласа да Марыі Дзмітрыеўны таксама надзвычай багатыя паводле сэнсава-эмацыйнай напоўненасці. Тут інтымныя пачуцці паэта цесна пераплецены з разнастайнымі аспектамі грамадскага жыцця. I гэта таксама паэзія высокага ўзору. I таксама вялікае дасягненне беларускага прыгожага пісьменства, адна з яе яскравых старонак, запоўненая рукою выдатнага майстра слова, нацыянальнага класіка.

Паступіў у рэдакцыю 05.04.05.

*Міхаіл Іосіфавіч Мушынскі* - член-карэспандэнт НАН Беларусі, доктар філалагічных навук, прафесар, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР імя Я. Коласа, галоўны навуковы супрацоўнік Інстытута літаратуры імя Я. Купалы НАН Беларусі.

*Дз.Ч. ПАШКЕВІЧ, І.А. ЧАРОТА*

## АДЛЮСТРАВАННЕ ГЕРАІЧНА-ТРАГІЧНАГА ВОПЫТУ ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ Ў БЕЛАРУСКАЙ І СЕРБСКАЙ ПРОЗЕ (на прыкладзе твораў Васіля Быкава і Міхайлы Лаліча)

Предложен сравнительный анализ отражения героического и трагического опыта Второй мировой войны в белорусской и сербской прозе на примере произведений Василя Быкова и Михайло Лалича.

Your attention is called to the comparative analysis of the reflection of the heroic-tragic experience of World War II in the works by Vasil Bykav and Mikhailo Lalich.

Як у беларускай, так і ў сербскай літаратуры другой паловы XX ст. асаблівую значнасць I знакавасць набыла ваенная тэматыка. Гэта заканамерна і абумоўлена асаблівасцю гістарычных выпрабаванняў, якія выпалі на долю нашых народаў у часы Другой сусветнай вайны. I беларусы і сербы вялі супраць акупантаў жорсткую барацьбу, якая ўражвала мужнасцю і адначасова вялікімі ахвярамі.

Акрамя падабенства ваенных лёсаў сербаў і беларусаў, існуе шмат адрозненняў, якія неабходна ўлічваць: 1941-1945 гг. для сербаў час не толькі нямецка-фашысцкай акупацыі, але і генацыду з боку былых суграмадзян, усташаў, а таксама грамадзянскай братазабойчай вайны паміж сіламі Югаслаўскага войска на чале з генералам Дражам Міхайлавічам і камуністычна-партызанскага руху на чале з Іосіпам Броз-Ціта. Перамога над фашызмам прынесла збаўленне не толькі ад знешняга ворага, але і ад каралеўскай улады. Была ўтворана новая федэратыўная дзяржава, і пачалося будаўніцтва сацыялізму. Аднак у далейшым шматлікія супярэчнасці прывялі да жорсткага канфлікта Югаславіі з СССР.

Тыпалагічна падобнае праяўлялася ў самасвядомасці і псіхалогіі народаў, якія вялі барацьбу з фашызмам і сталі пераможцамі. Пры гэтым нельга не звярнуць увагу на прысутнасць у светаадчуванні сербаў трагізму, таго, што можа быць названа «косаўскім архетыпам» - тымі праявамі свядомасці, якія звязаны з Косаўскай бітвай 1389 г. і яе вынікам - пяцісотгадовым турэцкім прыгнётам.

Мелася, акрамя таго, і свая спецыфіка ў развіцці літаратур. Сербскія пісьменнікі, як і іншыя югаславянскія, не адчулі моцнай залежнасці ад нарматыўна-дагматычных установак сацрэалізму і пры ўсіх супярэчнасцях аддавалі перавагу аналітызму і крытыцызму, што істотна адбілася на ўвасабленні тэмы вайны. У беларускай, як і ва ўсёй савецкай літаратуры, падобнае пачало заўважацца хіба што ў 1960-я гг.

Між тым, каб выявіць агульнае, паспрабуем супаставіць творы ваеннай тэматыкі вядомага беларускага пісьменніка Васіля Быкава і не меней вядомага сербскага празаіка Міхайлы Лаліча.

Абгрунтоўваючы правамернасць такога супастаўлення, можна было б зноўтакі паразважаць пра гістарычныя, палітычныя і культурныя ўмовы таго часу, у якіх жылі і працавалі гэтыя пісьменнікі, падкрэсліць падабенства іх лёсаў, звярнуць увагу на аналагічныя ролі ў культурным і грамадскім жыцці сваіх краін, на прызнанне іх твораў за межамі айчыны, прыгадаць асабістыя кантакты. Але мы не будзем падрабязна спыняцца на гэтым, а паспрабуем высветліць іх ідэйна-эстэтычныя пазіцыі, асаблівасці бачання і разумения вайны ўвогуле, вызна-

чальных падзей і сітуацый, герояў і антыгерояў. Дакладна акрэсліць усе паказчыкі «аўтарскіх сістэм» - справа складаная, аднак, імкнучыся знайсці агульнае ў ідэйна-эстэтычных поглядах В. Быкава і М. Лаліча, нельга не заўважыць, што гэтыя пісьменнікі зыходна засяроджваліся на калізіях: неабходнасці змагацца са зброяй у руках, а значыць - забіваць; абараняцца, але ж, пры пэўных умовах, і нападаць; вызнаючы гуманізм, у канкрэтных выпадках ігнараваць яго; вырашаць неймаверна складаныя праблемы маральнага выбару на кожным кроку, таму што ў смяротный барацьбе кожны твой крок можа стаць апошнім для цябе ці каштаваць жыцця некаму іншаму; спалучаць актыўнасць пазіцыі з адказнасцю і сумленнасцю; пераадольваць інстынкт самазахавання і знаходзіць сілы на свядомае ахвяраванне сабой... І ўсё гэта непарыўна сплятаецца разам.

*Васіль Быкаў* (1924-2003), якога называлі пісьменнікам адной тэмы - ваеннай, амаль з першых літаратурных спроб імкнуўся пераадолець распаўсюджаную ў літаратуры таго часу патэтыку. Па-align рознаму ацэньвалася і ацэньваецца інтэрпрэтацыя Быкавым праблемы «чалавек на вайне», але не выклікае асаблівых дыскусій той факт, што вайну найчасцей ён паказваў як справу пякельна цяжкую і адказную, але ў дадзеным выпадку непазбежную. Чалавеку на вайне наканаваны смяротныя выпрабаванні ўсіх яго сіл і здольнасцей, і ён мусіць праходзіць самую складаную і самую аб'ектыўную атэстацыю. У сувязі з гэтым не без падстаў многімі даследчыкамі адзначалася, што Быкаў наўмысна ставіць сваіх герояў у экстрэмальныя ўмовы, у так званыя межавыя сітуацыі, правяраючы на трываласць. Але мае сэнс і такое ўдакладненне: гэта праверка не на выключнасць, а на адпаведнасць нормам, і сітуацыі самі па сабе не з'яўляюцца вызначальнымі. Так, на нашу думку, могуць прачытвацца многія творы Быкава, у тым ліку і дэбютны - «Трэцяя ракета». Зрэшты, а хіба можна нейкі ваенны эпізод пазбаўляць азначэння «выключны»? Тады выходзіць, што ў цэлым вайна - стан для чалавека натуральны, звычайны. А Быкаў як раз сцвярджае адваротнае. Дастаткова згадаць, напрыклад, апавяданне «Адна ноч», аповесці «Мёртвым не баліць», «Дажыць да світання», «Знак бяды», а зрэшты ўсё ім напісанае. Іншая справа, падкрэслім яшчэ раз, што ў гэтых творах на першым плане знаходзяцца часцей за ўсё радавыя вайны - салдаты і малодшыя афіцэры - людзі самыя звычайныя.

Цікава таксама, што Быкаў не заўсёды клапоціцца пра тое, каб дэталёва прадстаўляць сваіх герояў, а тым болей - нюансаваць характары; часам, здаецца, свядома схематызуе іх, роўна як і сітуацыі, скарыстоўваючы пры гэтым супрацьпастаўленні, рэзкія кантрасты: мужны воін - баязлівец, самаахвярнае служэнне - здрадніцтва, высокая маральнасць - беспрынцыпнасць і інш. Яго цікавіць больш тып, чым асоба. І ў гэтых адносінах асабліва паказальнай з'яўляецца аповесць «Альпійская балада», у якой радавы Іван Цярэшка прадстае як абагульнены вобраз воіна-беларуса. «Альпійскую баладу» нездарма называлі творам этапным і для самога аўтара, і для ўсёй айчыннай літаратуры, хоць пафас гэтага твора ў цэлым для Быкава не характэрны. Адметныя рысы яго творчасці - «жорсткі рэалізм», амаль заўжды трагічныя канцоўкі, напружаныя калізіі, своеасаблівае суаднясенне праблем вайны з сучаснасцю, вылучэнне таго, што актуалізуецца ў грамадстве цяперашнім і выклікае дыскусіі.

І для творчасці *Міхайлы Лаліча* (1914-1993) тэма вайны стала галоўнай, вызначальнай, скразной. Ён таксама ваяваў, трапіў у палон, прайшоў канцлагеры, змагаўся з фашыстамі ў партызанскім атрадзе, пасля перамогі браў удзел ва ўсталяванні сацыялістычнага ладу, у апошнія ж гады жыцця быў сведкам развалу Сацыялістычнай Федэратыўнай Рэспублікі Югаславіі.

У яго творах адлюстравалася так многа асабістага, што па іх можна вывучаць біяграфію аўтара, а ў дадатак і геаграфію, І культуру, і гісторыю краіны, асабліва часоў Другой сусветнай вайны. Гэта, аднак, не азначае, што Лаліч з'яўляецца ў поўным сэнсе гісторыкам, які аб'ектыўна і бясстрасна апісвае падзеі. Ён, падобна Быкаву, імкнецца выказаць і даказаць сваю праўду, пры гэтым сцвярджаючы свае ідэалы, у тым ліку і палітычныя, свае прыхільнасці, свае сімпатыі-антыпатыі.

Паказальна, што шэраг герояў Лаліча пераходзяць з твора ў твор - нібыта пісьменнік не можа з імі разлучыцца. Тут зноў-такі ёсць нешта, што ўласціва

творчасці Быкава, а разам з тым I не вельмі відавочнае. Быкаў хаця і мадэліруе сітуацыі на прынцыпах сутнаснага падабенства і захоўвае асноўныя тыпы, аднак галерэю канкрэтных вобразаў мяняе ў кожным творы. Звяртае на сябе ўвагу і яшчэ адно адрозненне пры пэўным падабенстве: аддаючы перавагу цёмнаму каларыту ў карцінах вайны і жыцця ўвогуле, не абмінаючы супярэчнасцей і не хаваючы сумненняў, таксама засяроджваючыся на сітуацыях выпрабавальных і «межавых», сербскі пісьменнік больш за ўсё ўвагі надае праблемам індывідуальна-маральнага плана, а гэта значыць і выпрабаванням супярэчнасцямі індывідуалізму ў любой форме.

Гэта, дарэчы, стала асноўнай тэмай першага рамана Лаліча «Вяселле», галоўны герой якога перажывае істотную эвалюцыю: спачатку закпапочаны толькі сваім лёсам і праблемай свабоды ў дачыненні да сваёй асобы, апынуўшыся ў экстрэмальных умовах няволі, ён пачынае спасцігаць сувязь індывідуальнага з калектыўным і прыходзіць да разумения таго, як узнікае патрэба ахвяраваць сабою дзеля бліжніх. Лаліч не ігнаруе шчырых адчуванняў і перакананняў чалавека, не абсалютызуе ў ім палітычнай «правільнасці», але са сваіх пазіцый трактуе супярэчнасці народна-вызваленчага руху ў Югаславіі. Сваіх герояў пісьменнік досыць выразна індывідуалізуе, але найбольш яскрава ў яго прадстаўлены тып барацьбіта ваенна-рэвалюцыйнай эпохі, у вобразе якога камуністычна-палітычную ангажаванасць Лаліч імкнецца спалучаць з высокімі ідэаламі і памкненнямі. Такім чынам ён прадстаўляе пазітыўны вобраз пакалення саратнікаў - людзей мужных, самаахвярных, гераічных і разам з тым - не абыякавых да трагічнага лёсу народа ў часы братазабойчай грамадзянскай вайны.

Што ж датычыцца праблемы выбару, праверкі індывідуальнай годнасці чалавека і асабліва таго, што можна назваць выпрабаваннем адзінотай, то і паводле агульнага разумения іх значнасці, і паводле канкрэтна-жыццёвага зместу вельмі блізкія «Сотнікаў» і «Дажыць да світання» Быкава і «Снег сыходзіць» і «Разрыў» Лаліча. У рамане Лаліча «Разрыў» асэнсоўваецца лёс чалавека, які здаўся ў палон таму, што не змог вытрымаць адзіноты. Але і пасля гэтага, знаходзячыся ў няволі і чакаючы непазбежнай смерці, ён застаецца змагаром. Такім чынам, можна сказаць, что сербскі пісьменнік вылучыў дадатковы аспект праблемы, якую наша крытыка не без падстаў лічыла характэрнай для творчасці Быкава: «Што такое чалавек перад разбуральнай сілай бесчалавечных абставін? На што ён здольны, калі магчымасці адстаяць сваё жыццё вычарпаны ім і прадухіліць смерць немагчыма?» (Лит. обозрение 1973, 101). Не памылімся, калі скажам, што гэта праблема агульная для гэтых пісьменнікаў, толькі Лаліч рашэнню яе надаваў яшчэ больш рыгарызму. Фінал рамана «Разрыў» нагадвае фінал аповесці «Дажыць да світання». Прычым асаблівую нагрузку ў названых творах нясуць перадсмяротныя ўнутраныя маналогі герояў - дарэчы, прыём, які даволі часта выкарыстоўваюць абодва пісьменнікі дзеля найглыбейшага асэнсавання матывацыі таго, што па праву называюць подзвігам. I Быкаў, і Лаліч пераканаўча даводзяць, што на вайне самай важнай якасцю чалавека была духоўная трываласць, гатоўнасць зрабіць адзіна правільны выбар незалежна ад сітуацыі, бо заўжды так ці інакш трэба супрацьстаяць пэўнаму збегу акалічнасцей, годна здзяйсняць сваё прызначэнне на гэтым свеце, браць, паводле азначэння Ч. Айтматава, «не толькі безыменныя вышыні, але і вышыні чалавечага духу» (Вопр. литературы 1976, 150).

Задача паказаць вайну як пераадоленне жорсткай рэальнасці і супярэчнасцей унутры самога чалавека ва ўсёй складанасці, гераічным і трагічным змесце, усебакова адлюстраваць спецыфічную праблему выбару як філасофскую, маральную, духоўную, экзістэнцыяльную выводзіла як Быкава, так і Лаліча на адпаведны матэрыял і ўзровень асэнсавання.

У свой час рускі крытык А. Бачароў, аналізуючы ваенную прозу, адзначыў наяўнасць у ёй своеасаблівых «квантаў - твораў, якія з'яўляюцца амаль што адначасова, маюць падабенства ў сюжэце, ідэйнай скіраванасці» (Бочаров 1973, 23), нягледзячы на бясспрэчную творчую самастойнасць іх аўтараў. У дадзеным выпадку гэта пацвярджаецца.

Падагульняючы сказанае, зазначым: літаратуру як Беларусі, так і Сербіі немагчыма ўявіць без ваеннай тэмы. Пісьменнікі вось ужо шэсць дзесяцігоддзяў

нязменна звяртаюцца да тэмы Другой сусветнай вайны, праз выпрабаванні таго часу ацэньваючы мінулае, сучаснасць і будучыню. Паказальна, што нават сучасныя творы, не звязаныя ні храналагічна, ні тэматычна з тымі векапомнымі падзеямі, так ці інакш перадаюць водгулле таго трагічнага і тераічнага часу і служаць яго ўсведамленню ў рэальна-гістарычным змесце.

**Спіс літаратурных крыніц**

Бы каў В . 36. тв.: У 6 т. Мh., 1992-1993; Быкаў В.У. Выбр. тв. Мн„ 2004.
Л а л іч М . Джына / Пер. М. Паслядовіч // Югаслаўскія апавяданні. Мh., 1975. С. 140-154; Лалйч Михайло. Соч.: В 3 т. / Пер. Т. Вірты, І. Дорбы. М.,1989.

ЛІТАРАТУРА

Лит. обозрение. 1973. № 7. С. 101.
Вопр. литературы. 1976. № 8. С. 150.
Бочаров А. Человек и война. М., 1973. С. 23.
На мовы народаў Югаславіі былі перакпадзены наступныя творы Васіля Быкава: Bikov V. Mrtvi ne cutejo bolecin. Prev. *D2. II* lJubljanski dnevnik, 12.05.1968 - 13.04.1969; Bikov V. Mrtvi ne cutijo bolecin. Iz ruscine prev. Dusan Zeleznov. Ljubljana, 1974; Bikov V. Sotnikov. Povest. Prev. iz ruscine Branko Avsenak. Maribor, 1974; Bikov V. Na ezero. Prev. M. Karanfilovski // Sovremenost (Skopje). 1974. № 7. S. 645-650; Bikov V. Vucji copor. Prev. M.Colic. M.; Beograd$_1$ 1980: Bikov V.V.Znakzla. Sa ruskog prev. D. Jaksic. Beograd; Krusevac, 1986.

Пастушў у рэдакцыю 21.04.05.

*Дзяніс Часлававіч Пашкевіч* - студэнт 5-га курса філалагічнага факультэта.
*Іван Аляксеевіч Чарота* - доктар філалагічных навук, прафесар, загадчык кафедры славянскіх літаратур.

*У.А. НАВУМОВІЧ*

## КАНЦЭПЦЫЯ ЧАЛАВЕКА НА ВАЙНЕ Ў БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ: ПРАБЛЕМА ІНТЭЛЕКТУАЛІЗАЦЫІ ПРОЗЫ

Раскрываются пять основных этапов отражения военной темы в белорусской литературе: масштабная, «окопная правда», документалистика, воспоминания женщин и детей, философско-концептуальная проза. В результате интенсивного развития в прозе интеллектуального начала белорусская литература значительно обогатилась в жанрово-стилевом отношении.

Five main stages of war theme reflection in Belarusian literature are revealed: large scale, «trench truth», documentaries, reminiscences of women and children, conceptually philosophic prose. As the result of intensive development of intellectual principles in prose Belarusian literature has been significantly enriched in genre and style.

Незалежнасць Беларусі асветлена Вялікай Перамогай.

Менавіта ў выніку перамаганоснага завяршэння Другой сусветнай вайны за вялікі ўкпад у разгром гітлераўскага фашызму І як рэспубліка, якая найбольш пацярпела ў часы ваеннага ліхалецця, нароўні - Савецкі Саюз, Беларусь і Украіна - атрымалі права суверэннага голасу ў Арганізацыі Аб'яднаных Нацый. Пад дакументам аб утварэнні ААН стаіць подпіс народнага пісьменніка Беларусі М. Лынькова, які ў складзе дэлегацыі рэспублікі быў на канферэнцыі ў Сан-Францыска, калі было заснавана гэтае аўтарытэтнае міжнароднае калегіяльнае фарміраванне.

У беларускай літаратуры ў пасляваенны час надоўга і трывала запанавала ваенная тэма. Мастацтва слова заклікана раскрываць усю гаму чалавечых адчуванняў. Тэма вайны, цяжкай, непасільнай, руйнуючай не толькі хутары, вёскі, гарады, але і звыклы лад жыцця, людскія душы, была, бадай, адзіным абсягам, дзе галоўны акцэнт адводзіўся гераізму і патрыятызму народа ў святой справе абароны роднай зямлі ад чужаземных захопнікаў.

Доўгі час вайна ў літаратуры малявалася як супрацьстаянне двух светаў, дзвюх ідэалогій - духоўнасці і бездухоўнасці, як выяўленне каштоўнасці чалавечага жыцця, як яшчэ адна спроба зразумець магчымасці чалавека ў вірлівых катаклізмах XX ст. За гэтую асаблівую прывязанасць да ваенных падзей у адрас літаратуры, у тым ліку беларускай, не аднойчы сыпаліся папрокі, што, маўляў, падзеі вайны займаюць зашмат месца ў мастацкіх творах, што ваенная тэма